**І. М. Ермаковіч,**
настаўнік пачатковых класаў першай катэгорыі
Вішнявецкай СШ Стаўбцоўскага раёна

# «У свеце ветлівасці і дабрыні»: урок літаратурнага чытання ў 2 класе

Кожнаму настаўніку вядома, што паўнавартасны ўрок арыентаваны на развіццё інтэлектуальных, творчых магчымасцяў кожнага навучэнца. Але ж дзеці розныя не толькі па характары, здольнасцях, але і па жыццёваму вопыту і ўзроўню інтэлекту. Як пабудаваць урок так, каб навучанне ўсім прыносіла радасць разумення, абуджала цікавасць да прадмета?

У педагагічнай тэорыі і практыцы назапашаны вялікі арсенал метадаў і сродкаў дыферэнцыяцыі. На ўроках літаратурнага чытання дыферэнцыраваныя заданні могуць прапаноўвацца вучням падчас падрыхтоўкі да чытання тэксту, у ходзе аналізу зместу твора, на этапе абагульнення прачытанага і інш. Педагагічнае майстэрства настаўніка і складаецца ў тым, каб ўмела спалучаць розныя формы работы: класную, групавую, індывідуальную, улічваючы пры гэтым агульнае – для класа, тыповае – для груп і індывідуальнае – для асобных навучэнцаў.

Вашай увазе прапаноўваецца ўрок літаратурнага чытання ў 2 класе, дзе выкарыстаны прыёмы і метады дыферэнцыраванага навучання, якія на практыцы паказваюць сваю выніковасць.

**Тэма.** М.Танк “Жук і слімак”

**Мэта**: пазнаёміць вучняў з творам М.Танка “Жук і слімак”; садзейнічаць фарміраванню навыкаў правільнага чытання.

**Задачы**:

- ✓ фарміраваць навыкі ўспрымання мастацкага твора; садзейнічаць развіццю ўмення характарызаваць герояў на аснове іх паводзін, выказваць да іх свае адносіны;
- ✓ развіваць маўленчыя навыкі, уменне разважаць над прачытаным;
- ✓ садзейнічаць выхаванню паважлівага стаўлення да іншага чалавека, жаданне дапамагаць і рабіць дабро, душэўнай прыгажосці

**Тып урока:** камбінаваны ўрок

**Метады і прыёмы:**

1. Моўныя метады: апавяданне, тлумачэнне, гутарка, праца з падручнікам.
2. Наглядныя метады: назіранне, дэманстрацыя ілюстрацый.
3. Практычныя метады: вусныя практыкаванні.

**Абсталяванне:** падручнік, партрэт М.Танка, карткі з новымі словамі, карткі для работы ў групах, сігнальныя карткі для рэфлексіі.

ХОД УРОКА

**I. Арганізацыйны момант.**

Вочкі глядзяць і ўсё бачаць,
Вушкі слухаюць і ўсё чуюць,
Спачатку думаю, потым гавару,
Помню, што ў класе я не адзін

**II. Псіхалагічны настрой на ўрок.**

- Усміхніцеся адзін аднаму. Сядзьце ўтульна. Вось у такім добрым настроі пачнём наш урок – урок літаратурнага чытання.

**III. Моўная размінка.**

- А каб ваша чытанне было сапраўды прыгожым і правільным,пачнём наш урок як заўсёды з дыхальнай гімнастыкі, якая таксама ўмацоўвае ваша здароўе.

А) Інтанацыйная размінка. (Выбар інтанацыі для чытання)

Урок пачаўся!
Урок пачаўся?
Урок пачаўся.

Б) Гукавая размінка.

Ла-ла-ла – казка зноў да нас прыйшла.
Ды-ды-ды - казцы рады мы заўжды.
Жы-жы-жы – казку сёння раскажы.

**IV. Праверка дамашняга задання.**

А) Выразнае чытанне ўрыўка з тэксту.
Б) Пераказ прачытанага.
В)Расказаць пра выпадак, калі вам дзякавалі.

**Узаемаацэнка**

**V.Знаёмства з тэмай і мэтай урока**

Сёння на ўроку мы працягнем працу над тэмай “У свеце ветлівасці і дабрыні”. Назавіце дзеянні, якія мы павінны выканаць на ўроку? (слухаць, чытаць, думаць, адказваць на пытанні, абмяркоўваць, разважаць)

Пазнаёмімся з творам вядомага беларускага пісьменніка М.Танка.

Максім Танк (сапраўднае імя Яўген Іванавіч Скурко) — народны паэт Беларусі, пісьменнік і перакладчык - нарадзіўся 17 верасня 1912 г. у вёсцы Пількаўшчына Мядзельскага раёна Менскай вобласці ў сялянскай сям’і.

Ён пісаў казкі для дзяцей «Ехаў казачнік Бай», «Конь і леў», «Светлячок», шмат вясёлых, жартоўных вершаў. Яны падымаюць настрой, выклікаюць усмешку. Яго імя носіць Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт.

Я прапаную вам адгадаць загадкі.

- Капаецца ў брудзе.
Хто гэта будзе?

- Ці табе вядома?
Нават у дарозе
Ён заўсёды дома.

(малюнкі жука і слімака)

Мы пазнаёмімся з вершам «Жук і слімак»

**Пытанн**е. Давайце падумаем, аб чым будзе наш верш? (прагназаванне)

**Слоўнікавая работа**

-А зараз прачытаем спачатку словы, якія пры чытанні могуць у вас выклікаць цяжкасці і сэнс іх не зразумелы с. 84

**Фізкультхвілінка**

Устаньце, дзеткі, усміхніцеся,
Зямлі нашай пакланіцеся,
Усе да сонца падцягніцеся,
Улева, управа нахіліцеся,
Раз прысядзьце, два прысядзьце-
І за парты ціха сядзьце.

**VI. Падрыхтоўка да ўспрымання новага матэрыялу**

1.Чытанне верша настаўнікам.

Пра каго расказвае Максім Танк у сваім вершы?
Ці хочацца вам яшчэ раз прачытаць гэты верш?

2. Чытанне верша вучнямі.

( вучні адзначаюць незразумелыя словы)
Для чаго аўтар напісаў гэты верш?

3. Аналіз твора.

- Дзе сустрэліся жук і слімак?
- Ці выпадковая была гэта сустрэча?
- Як жылося слімаку? Прачытайце.
- Што перашкодзіла іх размове?
- Ці знайшоў жук сабе месца, каб схавацца ад дажджу?
- Да каго ён звярнуўся з просьбай? Прачытайце.
- Якім голасам звяртаецца жук да слімака?
- Ці стрымаў жук сваё абяцанне?
- Чаму ён не стрымаў яго?

4. Паўторнае чытанне верша (па ланцужку)

А як бы вы паступілі на месцы жука?
Што б вы яму параілі?
Што мы для сябе адкрылі, калі чыталі і перачытвалі гэты верш?
Ці можна гэты верш назваць казкай? Чаму?

**Гімнастыка для вачэй**

**VII. Этап абагульнення і сістэматызацыі ВУН**

1 група- чытанне па ролях сустрэчы жука і слімака

2 група- падрыхтаваць пытанні да верша.
(Хто на сябе хатку носіць? Як жук называе слімака?
Чаму жук не знайшоў сабе месца? Дзе схаваўся жук ад дажджу?)

3 група- выразнае чытанне на с.86. Пра што не ўспомніў жук?

-У вас на парце прыказкі. Выберце прыказку ў якой вызначаецца галоўная думка нашага ўрока.

Лепш крышку зрабіць, чым багата нагаварыць.
Высока падляцела, ды нізка села.
Няма смачнейшай вадзіцы, чым з роднай крыніцы

-Ці можна гэты верш назваць казкай? Чаму?

**VIII. Падвядзенне вынікаў**

З якім творам пазнаёміліся на ўроку?
Назавіце аўтара?
Чым вас зацікавіў верш?
Чаму вучыць вас твор "Жук і слімак"

**Тэст " Так ці не"**

Жук сустрэўся з мухай.
Слімак нёс з сабой ракавіну.
Цяжка жылося слімаку.
Ударыў дождж краплісты.
Жук схаваўся пад кустом.
Слімак пусціў жука ў хатку.
Жук паабяцаў насіць хатку.
Ён выканаў сваё абяцанне.

**IX. Рэфлексія**

Настаўнік:
Прадоўжыце сказ:
Я ацэньваю сваю працу на ўроку…(сігнальная картка)
Больш за ўсё мне спадабалася як адказваў…
Мне хацелася сказаць дзякуй…

**X. Дамашняе заданне**

1 група- вывучыць на памяць урывак (размова жука і слімака)
2 група- выразна чытаць па ролях
3 група- навучыцца выразна чытаць верш с. 84

Літаратура

1. Яковлева, В.В. Организация дифференцированного подхода в процессе усвоения знаний младшими школьниками. [Текст] / В.В. Яковлева // Начальная школа.- 2004.- № 5. - С. 38-42.

2. Кособуцкая, С.Н. Дифференцированное обучение на уроках литературного чтения.// Пачатковая школа. – 2008. - №6
«»